# ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ
# “ПА МЯСЦІНАХ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ВІЛЕЙСКАГА РАЁНА”

**Аўтары:** навучэнцы аб'яднання па інтарэсах “Музеязнаўства” дзяржаўнай установы адукацыі “Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна”.

**Кіраўнік:** Кучко Міхаіл Мікалаевіч, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства дзяржаўнай установы адукацыі “Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна”.

**Мэта экскурсіі:** фарміраванне грамадзянска-патрыятычных і духоўных якасцей асобы, выхаванне нацыянальнага светапогляду і самасвядомасці як грамадзян Рэспублікі Беларусь.

**Задачы экскурсіі:**

- азнаёміць наведвальнікаў з гістарычнымі помнікамі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі нашага раёна;
- садзейнічаць выхаванню каштоўнасных адносін да духоўнай, гістарычнай і культурнай спадчыны беларускага народа;
- фарміраваць пазітыўныя адносіны да захавання помнікаў, паказаць магчымасці гістарычнага краязнаўства падчас правядзення экскурсіі.

**Тып экскурсіі:** гістарычна-краязнаўчая.

**Від экскурсіі:** аўтобусная, веласіпедная, аўтамабільная.

**Маршрут экскурсіі:**

**Горад Вілейка, краязнаўчы музей:**
экспазіцыя “Першая сусветная вайна”.

**ДУА “Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна”:**
школьны музей “Спадчына”, экспазіцыя “Дзве вайны-памяць адна”.

**Вёска Папоўцы:**
капліца-помнік ахвярам Першай сусветнай вайны.

**Вёска Рускае Сяло:**
помнік “Спаса-Нерукатворнага”, помнік загінуўшым у гады Першай сусветнай вайны.

**Вёска Заброддзе:**
могільнік памерлых і загінуўшых салдат 29-га корпуса Рускай арміі;
царква святых Барыса і Глеба ў гонар памяці воінаў Першай сусветнай вайны;

**Вёска Бараўцы:**
каплічка у памяць ахвяр Першай сусветнай вайны, царква праваслаўная(былая уніяцкая, 1789 года заснавання)

**Горад Вілейка:**
гарадскі могільнік, брама уваходная з выявамі святых (узор 1916 года, аднаўлена ў 2015 годзе). Магілкі загінуўшых салдат і афіцэраў у 1915-1917 гадах у баях за Вілейку.

**Працягласць маршрута:** 44 км, 4 гадзіны.

**Змест экскурсіі:**

Вілейскі раён займае ў гісторыі нашай краіны адметнае месца.Да ліку значных гістарычных падзей у гісторыі ўсяго чалавецтва адносяцца падзеі

Першай сусветнай вайны, якія пакінулі на тэрыторыі Вілейскага раёна значныя адмеціны. Баі ў 1915-1916 гадах за Вілейку былі самымі жорсткімі і кравапралітнымі падчас Нарачанскай аперацыі. У Вілейскім раёне вядзецца змястоўная краязнаўчая работа і на аснове пошукава-даследчай дзейнасці краязнаўцаў і распрацаваны дадзены маршрут экскурсіі “Па мясцінах Першай сусветнай вайны ў Вілейскім раёне”. Падчас экскурсіі наведвальнікі знаёмяцца не толькі з гістарычнымі фактамі падзей Першай сусветнай вайны, але і бачаць, як захоўваецца гістарычная спадчына беларускага народа.

**Практычнае значэнне:**

дадзены матэрыял не толькі экскурсійны, але і навучальны, і выхаваўчы. Выкарыстоўваецца не толькі на ўроках, але і для правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў.

**Агульныя метадычныя ўказанні па тэме экскурсіі :**

- музейна-педагагічная падрыхтаванасць экскурсаводаў;
- гістарычна- краязнаўчая падрыхтаванасць экскурсаводаў.

**Агульныя арганізацыйныя указанні:**

- інструктаж па правілам бяспечных паводзін падчас экскурсійнага маршрута ўсімі ўдзельнікамі;
- безумоўнае выкананне правіл бяспечных паводзін падчас маршрута ўсімі ўдзельнікамі.

**Уступ да экскурсіі:**

арганізацыйны ўступ ажыццяўляецца падчас знаёмства з групай, агавораўваюцца ўсе арганізацыйныя пытанні, напамінанне пра правілы бяспекі падчас маршрута.

**Заключэнне:**

адказы на пытанні ўдзельнікаў, запіс у кнізе водгукаў аб уражаннях, прапановах, развітанне.

## Тэхналагічная карта маршрута экскурсіі
## “Па мясцінах Першай сусветнай вайны Вілейскага раёна”

| Маршрут | Месца астаноўкі | Аб’ект прагляду | Працягласць прагляду | Назва падтэмы і асноўныя пытанні | Арганізацыйныя пытанні | Метадычныя указанні |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Уступ** | | | | | | |
| Горад Вілейка, краязнаўчы музей, экспазіцыя; “Першая сусветная вайна” | Горад Вілейка, плошча Свабоды 8 | краязнаўчы музей, экспазіцыя“Першая сусветная вайна ў Вілейскім раёне” | 30 хвілін | Сустрэча і кароткае азнаямленне з групай. Экспазіцыя Вілейскага краязнаўчага музея (праводзяць супрацоўнікі музея. Экскурсія платна) | Азнаямленне з правіламі паводзін у музеі, размяшчэнне экскурсантаў | Кароткі аповяд пра падзеі Першай сусветнай вайны у Вілейскім раёне, матэрыял экспазіцыі. |
| **Пераезд у аг. Нарач, 17 км** | | | | | | |
| ДУА “Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна”, школьны музей “Спадчына”, экспазіцыя “Наш край у гады Першай сусветнай вайны” | Аг.Нарач, вуліца Кастрычніцкая 3, ДУА “Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна” | Школьны краязнаўчы музей “Спадчына”, экспазіцыя па Першай сусветнай вайне | 20 хвілін | Гістарычная даведка пра пошук і сістэматызацыю матэрыялаў экспазіцыі. | Парадак размяшчэння эксурсантаў у музеі, тэхніка паказа экспазіцыі. | Звярнуць увагу на пытанні экскурсантаў, музейна-педагагічную падрыхтаванасць экскурсаводаў. |
| **Пераезд у вёску Папоўцы, 3 км** | | | | | | |
| Вёска Папоўцы, капліца-помнік ахвярам Першай сусветнай вайны | Вёска Папоўцы Вілейскага раёна | Капліца-помнік ахвярам Першай сусветнай вайны. | 25 хвілін | Гістарычная даведка пра месца жыхароў вёскі падчас ваенных дзеянняў 1915-1916. | Капліца размешчана ў лесе, пераход пешшу з грунтовай дарогі. | Кароткі аповяд пра задуму стварэння капліцы, ход яе будаўніцтва. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Пераезд у вёску Рускае Сяло, 3 км** | | | | | | |
| Вёска Рускае Сяло, помнік “Спаса-Нерукатворнага”, помнік-памяць загінуўшым аднавяскоўцам у гады Першай сусетнай вайны | Шаша Вілейка-Смаргонь, 18-ты кіламетр. | помнік “Спаса-Нерукатворнага”, помнік загінуўшым у гады Першай сусветнай вайны | 30 хвілін | Даведка пра ўзвядзенне помніка і памятных знакаў на гэтым месцы. | Помнік размешчаны па блізу шашы, напамінанне пра правілы бяспечных паводзін, правілы дарожнага руху. | Звярнуць увагу на этапнасць і паслядоўнасць выкладання гістарычнага і краязнаўчага матэрыяла пра аб’ект экскурсіі. |
| **Пераезд у вёску Заброддзе, 5 км** | | | | | | |
| Вёска Заброддзе:<br>-могільнік памерлых і загінуўшых салдат 29-га<br>корпуса Рускай арміі | Вёска Заброддзе | Вёска Заброддзе:<br>-могільнік памерлых і загінуўшых салдат 29-га<br>корпуса Рускай арміі; | 40 хвілін | Інфармацыя пра заснаванне, стварэнне і цяперашняе існаванне аб'екта экскурсійнага маршрута. | Мемарыяльны могільнік размешчаны ў лесе на адлегласці аднаго кіламетра ад шашы Смаргонь-Вілейка. | Экскурсію правесці ў форме гістарычнай даведкі пра падзеі, якія садзейнічалі стварэнню гэтага мемарыяла. Вызначэнне ролі мясцовага краязнаўцы Барыса Цітовіча. |
| **Пераезд(пераход) у вёску Заброддзе, 2 км** | | | | | | |
| Царква святых Барыса і Глеба ў гонар памяці воінаў Першай сусветнай вайны | Вёска Заброддзе, вуліца Цэнтральная 1 | царква святых Барыса і Глеба ў гонар памяці воінаў Першай сусветнай вайны (Экскурсія па запісу і платная) | 35 хвілін | Экскурсію праводзяць супрацоўнікі Музея вёскі Заброддзе | Царква размешчана каля вёскі Заброддзе. Актыўны заснавальнік і стваральнік дадзенай царквы – лаўрэат Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае | Экскурсію праводзяць супрацоўнікі Музея вёскі Заброддзе |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | адраджэне” Барыс Цітовіч | |
| **Пераезд у вёску Бараўцы, 6 км** | | | | | | |
| Вёска Бараўцы: каплічка у памяць ахвяр Першай сусветнай вайны, царква праваслаўная (былая уніяцкая 1789 года адкрыцця) | Вёска Бараўцы, вуліца Першамайская. | каплічка у памяць ахвяр Першай сусветнай вайны, і | 20 хвілін | Краязнаўчая інфармацыя пра будаўніцтва капліцы на месцы пахавання салдата Рускай арміі у 1916 годзе(дакументальны матэрыял). | Капліца размешчана каля шашы Смаргонь-Вілейка, парадак пераходу шашы, выкананне правіл бяспечных паводзін і правіл дарожнага руху. | Аповяд пра стылістыку будаўніцтва капліц, неабходныя атрыбуты капліцы. |
| | Вёска Бараўцы | праваслаўная царква | 20 хвілін | Гістарычная інфармацыя пра заснаванне царквы, пра яе існаванне і статус у цяперашні час. | Царква пабудавана на вясковых могілках. | Царква ўяўляе сабой змешаную архітэктуру праваслаўя і ўніяцтва |
| **Пераезд у горад Вілейка, Брама гарадскога могільніка, 8км** | | | | | | |
| Горад Вілейка, гарадскі могільнік, брама уваходная з выявамі святых (узор 1916 года, адноўлена ў 2015 годзе). Могілкі загінуўшых салдат і афіцэраў у 1915-1917 гадах у баях за Вілейку | Горад Вілейка, вуліца Першае Мая. | брама уваходная з выявамі святых (узор 1916 года, адноўлена ў 2015 годзе). Могілкі загінуўшых салдат і афіцэраў у 1915-1917 гадах у баях | 20 хвілін | Інфармацыя пра аднаўленне брамы, якая была разбурана ў 1942 годзе і адноўленна па фатаграфіі у 2015 годзе | Брама размешчана на ўваходзе гарадскіх могілак, парадак размяшчэння і выкананне правіл бяспечных паводзін і правіл дарожнага руху. | Брама сімвалізуе сабой славу загінуўшым падчас баявых дзеянняў 1915-1916 гадоў (Нарачанская наступальная аперацыя) |







**Фота 1-2. Горад Вілейка, краязнаўчы музей, экспазіцыя; “Першая сусветная вайна”**





**Фота 3-4. ДУА “Нарацкая сярэдняя школа Вілейскага раёна”, школьны музей “Спадчына”, экспазіцыя “Дзве вайны-памяць адна”**





**Фота 5-6. Вёска Папоўцы, капліца-помнік ахвярам Першай сусветнай вайны**







**Фота 7-8. Вёска Рускае Сяло, помнік “Спаса-Нерукатворнага”, помнік загінуўшым у гады Першай сусветнай вайны**






**Фота 9-10. Вёска Заброддзе: могільнік памерлых і загінуўшых салдат 29-га корпуса Рускай арміі**






**Фота 11-12. Вёска Заброддзе: -царква святых Барыса і Глеба ў гонар памяці воінаў Першай сусветнай вайны**





**Фота 12-13. Вёска Бараўцы: каплічка у памяць ахвяр Першай сусветнай вайны, царква праваслаўная (былая уніяцкая 1789 года адкрыцця)**





**Фота 14-15. Горад Вілейка, гарадскі могільнік, брама уваходная з выявамі святых (узор 1916 года, адноўлена ў 2015 годзе). Могілкі загінуўшых салдат і афіцэраў у 1915-1917 гадах у баях за Вілейку**